«Кармэн» Ж.Бізэ (1933), «Чаравічкі» П.Чайкоўскага (1949), «Тоска» Д.Пучыні (1950), балеты «Князь-возера» (1949) і «Палымяныя сэрцы» (1955) В.Залатарова, «Салавей» М.Крошнера (1950) і інш. Аўтар музыкі да драм. спектакляў.

**ГІЦІХ** Міхаіл (?—1654), літаратар, палеміст. Нарадзіўся ў Беларусі. Выхоўваўся ў духу арыянства. З 1607 вучыўся ў Альтдорфскай гімназіі (Германія), выключаны за прапаганду рэфармацыйных ідэй. Паслядоўнік С.*Буднага*. У 1611 вярнуўся ў Беларусь, жыў у Навагрудку. Пісаў на лац. мове. Вядомы філас. трактатамі («Аб задавальненні Хрыста», 1612), палемікай і перапіскай з сябрамі («Аб задавальненні... паміж М.Гіціхам, сацыніянцам і Л.Люцыусам артадоксам», 1628). У перапісцы з польск. мысліцелямі Я.Крэлем, І.Маскажэўскім, М.Руарам выказваў думкі пра сілу чалавечага розуму і законы прыроды (1677). Склаў алфавітны даведнік «Багаслоўскія зборнікі» (1649).

**ГЛАБАЛІЗА́ЦЫЯ**, узрастаючая ўзаемазалежнасць дзяржаў у галіне эканомікі, палітыкі, інфармацыі; працэсы сучаснай сацыякультурнай дынамікі, звязаныя з універсалізацыяй рынка, дамінаваннем неаліберальных форм дэмакратыі, змяненнем ролі дзяржавы і нацый, пераважаннем транснац. праектаў у розных сферах жыцця, утварэннем аднапалярнага свету. Г. прыводзіць да ўтварэння глабальнай сусв. прасторы, скарачэння ролі нац. дзяржаў і нац. культур, ускладнення форм культ. ідэнтычнасці, пераходу да гібкіх тэхналогій кіравання. Пачатак Г. звычайна датуецца канцом 20 ст. Некаторыя вучоныя не лічаць Г. якасна новым этапам гісторыі зах. грамадства. Выкарыстанне механізмаў Г. дазваляе стварыць эфектыўныя спосабы кіравання культ. працэсамі на падставе камерцыйнага падыходу. Г. садзейнічае перамозе мадэлі грамадства ўсеагульнага спажывання, што спараджае працэсы лінгваўніфікавання (на базе англ. мовы), прычым прыналежнасць да моўнай прасторы не раўназначная нац. ідэнтычнасці. Пад вызначальным уплывам амер. масавай культуры складваецца аднатыповая сусв. культ. прастора, перaадольваецца падзел культуры на масавую і элітарную. Ва ўмовах Г. захоўванню прыярытэту зах. мадэлей у культ. дзейнасці, л-ры і мастацтве супрацьстаіць узмацненне тэндэнцый разнастайнасці і адрознення паміж культурамі. Адна з важных тэндэнцый глабальнай культуры заключаецца ў пераадоленні дамінанты зах. культуры, праяўленні актыўнага інтарэсу да культ. дыялога.

Мастацтва перыяду Г. ў многім страчвае сваю аўтаномнасць, змяняюцца яго традыц. функцыі, яно пачынае асэнсоўвацца як рамяство. На першае месца выходзяць маст. сродкі, а не мэты, што звязана з татальнай тэхнізацыяй, стварэннем эстэтыкі кіберпрасторы. У крытэрый эстэтычнасці ператвараецца выкарыстанне высокіх тэхналогій. Эстэтыка транскультурацыі вызначаецца як множнасць і незавершанасць пазіцыі і суб'ектнасці мастака.

Г. уплывае на прадмет і метадалогію даследавання гуманітарных навук, нараджае тэндэнцыю да фарміравання міждысцыплінарных парадыгм ведаў. Тэндэнцыі Г. яскрава вызначыліся ў культ. прасторы Беларусі. Краіна прымае актыўны ўдзел у разнастайных міждзярж., міжнац. і міжкульт. камунікацыях. Майстры бел. культуры ўдзельнічаюць у шырокім коле міжкульт. і міжнац. кантактаў, актыўна презентуюць свае дасягненні і каштоўнасці ў сусв. глабальным кантэксце. *В.Р.Языковіч.*

*Л.Главацкая. Букет і паўлін. 1990-я гг.*



**ГЛАВА́ЦКАЯ** Лідзія Рыгораўна (н. 1.5.1936, в. Падыгрушша Смалявіцкага р-на), беларускі майстар пляцення мастацкіх вырабаў з саломкі. У творчасці пераважаюць работы анімалістычнага жанру (фігуркі коней, аленяў, пеўняў і інш.), кветкі, букеты, «павукі», анёлы, у якіх дасягае надзвычайнага дэкар. эфекту, чаргуючы тонка апрацаваныя рэльефныя саломінкі з гладкімі, збіраючы іх у пучкі ці асобныя дэталі: «Зязюля» (1972), «Конь» (1975), «Певень» (1976), «Алені» (1979), «Чапля» (1981) і інш. Стварае творы манумент.-дэкар. характару (шэраг пано на тэмы твораў М.Багдановіча для афармлення інтэр'ераў музея М.Багдановіча ў Мінску, 1991; макет Мінскага Святадухаўскага кафедральнага сабора да 1000-годдзя хрышчэння Русі, 1988, і інш.).

**ГЛАВА́ЦКІЯ**, беларускія мастакі 18—19 ст., бацька і сын. А н т о н і (каля 1750—1811), жывапісец, тэатр. мастак, партрэтыст. Быў дэкаратарам у тэатрах Зорыча ў Шклове (1780-я гг.), архіепіскапа С.Богуш-Сестранцэвіча ў Магілёве (1792— 1802, і прыдворны жывапісец), у трупе А.Жукоўскага ў Мінску (да 1793) і антрэпрызе М.Кажынскага (1802— 05), разам з якой пераехаў у Вільню (1805—10). Займаўся распрацоўкай ілюмінацыйных праграм і феерверкаў, пісаў партрэты. Аўтар партрэта архіепіскапа, роспісаў у цэрквах і касцёлах Магілёва. Ю з а ф Г і л я р ы (14.1.1789, Мінск — 21.12.1858), жывапісец, графік, тэатр. мастак. Сын і вучань Антонія. У 1810-я гг. вучыўся ў Вілен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ